Раскинулись рельсы далёко,
По ним эшелоны гремят,
Они с Украины вывозят
В Германию наших девчат.

Прощай же, родной городишко,
И ты, дорогая семья,
И ты, чернобровый мальчишка,
И первая встреча моя.

Прощайте, зеленые парки, —
Мне больше уж вас не видать.
Я буду в неметчине этой
Свой век молодой горевать.

А если вернется с победой
Мой брат, черноморец, домой,
То вы ему всё расскажите
Тогда о сестрёнке родной.



.Галіна Мікітаўна Петрык нарадзілася ў Палтаўскай вобласці. Марыла аб цікавым і прыгожым жыцці. Аднак ўсе мары абарваў час выпрабаванняў — Вялікай Айчыннай вайна. Фашысты захапілі яе родную вёску. У 1943 годзе дзяўчыну з сяброўкай вывезлі ў Германію. Той страшны дзень запомніўся навечна. Усю моладзь, старэй 15 гадоў, сагналі у цэнтр вёскі, зачыталі штосьці на нямецкай мове і пагрузілі ў крытыя брэзентам машыны. Уночы прывезлі на нейкую станцыю і пагрузілі ў чыгуначныя вагоны.

Галіна Мікітаўна папала ў заходнюю Германію, у невялічкі гарадок. У нямецкага гаспадара, куды папала дзяўчына, было шмат палонных французаў і англічан. Галіна Мікітаўна папала на кухню, дзе гатавалі яду палонным. Працавала цяжка, з раніцы і да позняга вечара. Акрамя кухні Галіна Мікітаўна прыбірала дома ў гаспадара, у якога была вялікая сям'я.

У палоне Галіна Мікітаўна пазнаёмілася са сваім першым мужам. Яе абраннікам стаў хлопец-земляк, Казімір Субаткевіч. І ні страх, ні бяда, ні гора іх не разлучылі. У 1945 годзе ў Германіі ў іх нарадзілася дачка, якую, як і маці, назвалі Галінай.

Пасля заканчэння вайны Галіна Мікітаўна з мужам і дачкой вярнуліся на радзіму мужа, у в. Карлаўшчызну Астравецкага раёна. Муж пасля цяжкіх раненняў хутка памёр і Галіна Мікітаўна засталася адна з дачкой.

Як ні было цяжка, але час лечыць і жанчына выйшла замуж за мясцовага хлопца Іосіфа Андрэевіча Петрыка, нарадзіла яшчэ чацвёра дзяцей.

Доўгае жыццё пражыла Галіна Мікітаўна. Але памяць ўсё часцей выбірае не эпізоды мірнага жыцця, а ваенных гадоў: аб мёртвых салдатах, параненых, якіх практычна жывымі закапвалі ў зямлю, аб бамбёжках, аб тым, як даводзілася сабіраць забітых і хаваць іх.







УДОСТОВЕРЕНИЕ
ПЕТРИК
Галина
Никитична
НАГРАЖДЕН (А)
ЮБИЛЕЙНОЙ МЕДАЛЬЮ
"60 ЛЕТ ПОБЕДЫ
В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ
1941 - 1945 гг."
От имени Президента
Республики Беларусь
медаль вручена
"23" ........ 2005 года
Военный комиссар
(должность и подпись лица,
М.П. ........ П. Мазанович
вручившего медаль)




Адрас:

г.п. Астравец

вул. Набярэжная,6

Тэлефон: 8-01591-21-0-90

Эл. пошта:

ostrov_bibl@mail.grodno.by


**Баброўніцкая бібліятэка-музей**

Серыя "Яны прайшлі дарогамі вайны"

# Галіна Мікітаўна Петрык

## вязень Вялікай Айчыннай вайны




2012